# Еўропа для моладзі

Алеся Бялейник, Вольга Арцюх

**Праграма "Моладзь у дзеянні" — гэта новая праграма Еўрапейскай камісіі, якая дзейнічае на працягу 2007-2013 гг. Праграма стварае вялізныя магчымасці для маладых людзей, якія хацелі б самаразвівацца і адукоўвацца, знаеміцца з іншымі культурамі, набываць досвед грамадскай дзейнасці.**

Адным з найважнейшых кірункаў праграмы "Моладзь у дзеянні" з'яўляецца наладжванне супрацоўніцтва паміж моладдзю з краін-удзельніц Эўрасаюза і Усходняй Еўропы і Каўказу (Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Малдова, Расія, Украіна). Так, беларусы ў ліку прадстаўнікоў іншых усходнееўрапейскіх і каўказскіх краін могуць браць удзел у наступных акцыях праграмы:

**1.** Еўрапейская валанцерская дзейнасць (Акцыя 2). У межах гэтай Акцыі моладзь з краін Еўрасаюза можа дзейнічаць у якасці валанцераў у арганізацыях з Усходняй Еўропы і Каўказу цягам да 1 году. Гэтаксама маладыя людзі з Усходняй Еўропы і Каўказу могуць працаваць у якасці валанцераў у краінах Еўрасаюза.

2. Моладзевыя абмены (Акцыя 3.1). Прадстаўляе магчымасць групам моладзі з розных краін сустрэцца і пазнаеміцца з культурнымі асаблівасцямі адно аднаго і г.д.

**3.** Трэнінгі і развіцце сеткавага супрацоўніцтва. Гэты кірунак падтрымлівае адукацыйныя трэнінгі, звязаныя з працай з моладдзю, у прыватнасці — абмены досведам, добрай практыкай паміж молодзевымі лідэрамі, ідэямі праектаў, якія могуць паспрыяць развіццю сеткавага супрацоўніцтва і доўгатэрміновых якасных праектаў.

## Якім чынам можна ўзяць удзел у праграме "Моладзь у дзеянні"?

Можна распрацаваць праект, напісаць заяўку на яго фінансаванне, падаць яе і, калі яна будзе ўхвалена, атрымаць на рэалізацыю праекта грошы. Аднак падаваць заяўку можа толькі арганізацыя з Праграмных краін (спіс іх можна знайсці на пададзеных ніжэй вэбпляцоўках). Арганізацыі з Беларусі могуць выступаць як партнеры ў такога кшталту праектах.

Падаваць заяўкі ў Нацыянальныя Агенствы Праграмы (а такія існуюць ва ўсіх краінах Еўрасаюза) можна ў вызначаныя тэрміны, гэта значыць да:

- 1 лютага
- 1 красавіка
- 1 чэрвеня
- 1 верасня
- 1 лістапада.

Калі заяўка будзе ўхвалена, дзейнасць можа быць распачата не раней, як праз тры месяцы пасля тэрміну падачы заяўкі на фінансаванне праекта.

Рэалізацыя праектаў можа адбывацца як на тэрыторыі краін Еўрасаюза, так і на тэрыторыі іншых краін (напр., Беларусі).



## Прыярытэты праграмы "Моладзь у дзеянні":

**1.** Еўрапейскае грамадзянства (магчлівасць для маладых людзей задумацца над актуальнымі пытаннямі развіцця Еўрапейскага грамадства і стварыць лепшыя ўмовы для актыўнага ўдзелу моладзі ў жыцці іх лакальных супольнасцей).

**2.** Культурная разнастайнасць ( павага да культурнай, этнічнай, рэлігійнай разнастайнасці ў Еўропе, барацьба супраць расізму і ксенафобіі).

**3.** Удзел моладзі (заахвоціць маладых людзей быць актыўнымі грамадзянамі і актыўна дзейнічаць у іх штодзенным жыцці і жыцці іх супольнасцей ).

**4.** Уключэнне маладых людзей з абмежаванымі магчымасцямі (фізічнымі, сацыяльнымі, геаграфічнымі, эканамічнымі).

## Аб нефармальнай адукацыі

Гісторыя праграмы пачалася даволі даўно, у 1993 годзе, праграма тады называлася "Моладзь для Еўропы", і за мінулыя гады была рэалізавана вялікая колькасць міжнародных моладзевых праектаў. Адзін з галоўных элементаў праграмы гэта нефармальная адукацыя. Стваральнікі і шматлікія ўдзельнікі праграмы атрымоўвалі ў працэсе нефармальнага навучання важныя і карысныя навыкі ў разнастайных галінах жыцця.

З часам якасць праектаў паляпшалася, галіны навучання пашыраліся і прыйшоў момант, калі пытанне аб прызнанні нефармальнай адукацыі і навыкаў, якія атрымоўваюць маладыя людзі ў працэсе нефармальнага навучання, стала актуальным і абгрунтаваным.

З гэтага моманту пачалася праца над распрацоўкай так званай "Еўрапейскай стратэгіяй аб ратыфікацыі і прызнанні нефармальнага навучання ў кантэксце праграмы "Моладзь у дзеянні".

Гэта стратэгія імкнецца да дасягнення 3 мэтаў:

1. Ацэнка ўласнага (асабістага) вопыту, атрыманага ў працэсе нефармальнага навучання;
2. Сацыяльнае прызнанне нефармальнага навучання;
3. Працаўладкаванне маладых людзей і працаўнікоў з моладдзю.

Прызнанне вопыту. Ведаў і навыкаў.

Для гэтага група экспертаў распрацавала шэраг так званых ключавых кампетэнтнасцей, якія могуць быць развітыя ў працэсе нефармальнага навучання:

– камунікацыя на роднай мове,
– камунікацыя на замежных мовах,
– матэматычныя кампетэнтнасці і базавыя кампетэнтнасці ў навуцы і тэхналогіях,
– сацыяльныя і грамадзянскія кампетэнтнасці,
– развіцце ініцыятывы і прадпрымальніцкіх здольнасцей,
– культурная дасведчанасць і самавыражэнне.

Пачынаючы з 2007 года, кожны ўдзельнік праектаў у межах праграмы "Моладзь у дзеянні" мае права атрымаць сертыфікат (YouthPass), які складаецца з 2 частак: апісанне праекта, яго мэтаў і задач, і персанальнае апісанне ўдзельнікам тых навыкаў, якія ен\яна развілі пад час праекта.

Больш пра YouthPass можна даведацца тут: www.youthpass.eu www.youthandrecognition.eu.




Інфармацыю пра праграму "Моладзь у дзеянні" можна знайсці на вэб-пляцоўках: http://ec.europa.eu/youth/yia/index_en.html, http://eacea.ec.europa.eu/youth/index_en.htm.

## Дзе можна атрымаць дадатковую інфармацыю?

Спецыяльна для прасоўвання і развіцця праектаў праграмы "Моладзь у дзеянні" ва Уходняй Еўропе і на Каўказе быў створаны Кантактавы рэсурсовы цэнтр SALTO YOUTH у Варшаве.

SALTO імкнецца пашырыць магчымасці супрацоўніцтва паміж арганізацыямі з краін Еўрасаюза і Усходняй Еўропы і Каўказу. Дапамога з боку SALTO заключаецца ў пошуку кантактаў, партнераў і развіцці праектаў з арганізацыямі Еўрасаюза.

Інфармацыю пра SALTO EECA можна знайсці на вэб-пляцоўках: http://www.salto-youth.net/eeca, http://www.salto-eeca.eu.




## Звяртайся да мультыплікатараў!

У краінах Усходняй Еўропы і Каўказа створан адмысловая сетка мультыплікатараў, якія распаўсюджваюць інфармацыю і практычны досвед арганізацыі праектаў у межах праграмы "Моладзь у дзеянні" ў сваіх рэгіенах.

У Беларусі такая сетка складаецца з чатырох чалавек, якія прэзентуюць свае арганізацыі ў тым ліку і як інфармацыйныя цэнтры пры SALTO EECA:

– **Аляксандр Мазуркін,**
Моладзевы адукацыйны цэнтр "Фіяльта",
mazurkin.a@gmail.com;

– **Алеся Бяленік,**
ГА "Цэнтр інфармацыйнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў "Трэці сектар"", kryvichanka@yahoo.com;

– **Вольга Арцюх,**
Беларускае Моладзевае Грамадскае Аб'яднанне "Новыя твары",
oartsiukh@gmail.com;

– **Яраслаў Алейнік,**
Ліга добраахвотнай працы моладзі,
sl41074@yahoo.com.

З дапамогай гэтых людзей можна атрымаць інфармацыю, якая тычыцца дзейнасці ў межах праграмы "Моладзь у дзеянні". Таксама можна дамаўляцца з імі пра прэзентацыю Праграмы "Моладзь у дзеянні" і трэнінгі па развіцці, рэалізацыі і ацэнцы праектаў у яе межах. ■